гадоў вядзецца праца па падрыхтоўцы серыі «Этнакультурныя працэсы ў мінулым і сучаснасці», накіраванай на захаванне і развіццё ўсёй разнастайнасці культурных традыцый беларускага этнасу. Чатыры кнігі з шасці запланаваных ужо надрукаваны. Лагічным працягам гэтай серыі стане кніга, прысвечаная Заходняму Палессю. Выхад апошняй плануецца ў самы бліжэйшы час.

**Библиографические ссылки:**


1. Беларускае народнае адзенне / Акадэмія навук БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 94 с.
2. Браім, І. М. Рыбалоўства ў Беларусі (гісторыка-этнаграфічны нарыс) / рэд. М. Я. Грынблат. Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 136 с.
3. Буракоўская, Н. І. Традыцыйныя лесахімічныя промыслы Беларускага Палесся / Н. І. Буракоўская // Быт і культура беларусаў : тэзісы дакладаў навук. канф. «Быт і культура беларусаў», Мінск, красавік 1984 г. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. Мінск, 1984. – С. 28–29.
4. Гурков, В. С., Терехин, С. Ф. Занятие издревле благородное / В. С. Гурков, С. Ф. Терехин. Минск : Полымя, 1987. – 136 с.
5. Курилович, А. Н. Белорусское народное ткачество / А. Н. Курилович. – Минск : Наука и техника, 1981. – 119 с.
6. Материальная культура белорусов / Л. А. Молчанова. – Минск : Наука и техника, 1968. – 230 с.
7. Милюченков, С. А. Белорусское народное гончарство / С. А. Милюченков. Минск : Наука и техника, 1984. – 183 с.


УДК 321(476)"19"(06)+327(476)(06)

## НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВОЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ МУЗЕЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

**Л.У. Бярэйшык**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр.Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; Bereischik@bsu.by*

У артыкуле разглядаецца сучасны этап развіцця нарматыўна-прававой базы па рэгуляванню сферы музейнай дзейнасці згодна прынятаму і ўступіўшаму ў сілу ў 2017 г. Кодэксу аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь.

***Ключавыя словы:*** музейнае заканадаўства; нарматыўна-прававое забеспячэнне музейнай дзейнасці; гісторыка-культурная спадчына; дзяржаўнае рэгуляванне.

## НОРМАТИВНО-ПРАВОВОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ МУЗЕЙНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ

**Л.В. Берейшик**

*Белорусский государственный университет,*
*пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь; Bereischik@bsu.by*

В статье рассматривается современный этап развития нормативной правовой базы по регулированию сферы музейной деятельности согласно принятому и вступившему в силу в 2017 г. Кодексу о культуре Республики Беларусь.

***Ключевые слова:*** музейное законодательство; нормативно-правовое обеспечение музейной деятельности; историко-культурное наследие; государственное регулирование.

## THE PRESENT DAY LEGISLATION OF MUSEUM ACTIVITY

**L.V. Bereishik**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus; Bereischik@bsu.by*

The article reviews the present day legislation of museum activity based on the Code of Culture of the Republic of Belarus issued in 2017.

***Key words:*** museum legislation; standard legal support of museum activities; historical and cultural heritage; official regulation.

Вынікам неперарыўнага развіцця і ўдасканалення заканадаўчай базы у сферы аховы і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны ў 1990-2010-я гг. стала прынянцце 20 ліпеня 2016 г. і ўвядзены ў дзеянне з 3 лютага 2017 г. Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры. Кодэксам ўстаноўлены прававыя, сацыяльна-эканамічныя, арганізацыйныя асновы ў культурнай дзейнасці ў мэтах захавання і выкарыстання культурных каштоўнасцей, развіцця арганізацый культуры [3].

У дзень падпісання Кодэкса Мініст культуры Б. Святлоў паведаміў, што яго распрацоўкай каля пяці гадоў займалася вялікая колькасць людзей і ў выніку плённай працы атрымаўся цікавы дакумент, які працягвае традыцыі

Статута ВКЛ, а таксама кодэкснага мыслення, характэрнага для беларускай правазнаўчай практыкі. У новым дакуменце кадыфіцыравана больш 60 нарматыўных прававых актаў рознай юрыдычнай сілы, у тым ліку сем законаў, чатыры указы Прэзідэнта Беларусь, каля 20 пастаноў урада і каля 30 нарматыўных прававых актаў Міністэрства культуры краіны [6]. Уключэнне нарматыўных прававых актаў у адзіны заканадаўчы дакумент дазваляе забяспечыць усебаковае сістэмнае прававое рэгуляванне грамадскіх адносін, звязаных з ажыццяўленнем розных відаў і накірункаў культурнай дзейнасці, стварыць эфектыўны прававы механізм забеспячэння правоў і свабод грамадзян у гэтай галіне.

Кодэкс складаецца з пяці раздзелаў, 27 глаў і 257 артыкулаў, якія сістэмна і комплексна рэгулююць прававыя адносіны ў розных сферах культурнай дзейнасці. Чацверты раздзел "Культурная дзейнасць" уключае нормы, якія рэгулююць сферу аховы гісторыка-культурнай і археалагічнай спадчыны, бібліятэчную, музейную справу, народныя мастацкія рамёсты, кінематаграфічную дзейнасць і іншыя напрамкі культурнай дзейнасці.

У Кодэкс уключаны асноўныя палажэнні Закона "Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь" 2005 г. і Закона "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь" 2011 г., якія прайшлі выпрабаванне часам. Азначэнні галоўных тэрмінаў, у асноўным, супадаюць з ранейшай іх фармулёўкай. Пашырана азначэнне тэрміна "музейныя калекцыі", у склад якой уваходзяць акрамя музейных прадметаў таксама навукова-дапаможны і сыравінны матэрыял. Адпаведныя змены ўнесены ў азначэнне тэрміна "музей" – гэта арганізацыя культуры або падраздзяленне юрыдычнай асобы, якія выяўляюць прадметы музейнага значэння, камплектуюць музейныя фонды, ажыццяўляюць на пастаяннай аснове ўлік і захоўванне музейных прадметаў, навуковадапаможных і сыравінных матэрыялаў, вывучэнне, выкарыстанне і папулярызацыю музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў [3, арт. 159]. Дадзеная трактоўка тэрміна адравядае яго азначэнню у Статуце Міжнароднага савета музеяў, прынятага ў 1989 г. на 16-й Генеральнай Асамблеі ІКОМ, а яго апошняя рэдакцыя бала зацверджана на нечарговай Генеральнай Асамблеі ў 2017 г. , дзе "музей гэта дзейнічаючая на сталай аснове некамерцыйная арганізацыя, якая служыць грамадству, клапоціцца аб грамадскім развіцці, з'яўляецца адкрытай для публікі і з мэтай пазнання, навучання і забавы збірае, захоўвае, вывучае, дэманструе і папулярызуе матэрыяльную і нематэрыяльную спадчыну чалавецтва і асяроддзя яго пражывання" [2]. За апошняе дзесяцігоддзе музеі радыкальна змянілі сваю палітыку і практыку, скарэктавалі і па-новаму вынайшлі свае прынцыпы, таму прадстаўнікі міжнароднай музейнай супольнасці прыйшлі да высновы, што дадзенае азначэнне музея больш не адлюстроўвае праблемы і разнастайныя погляды. У 2016 г. быў створыны спецыяльны Камітэт ІКОМ (MDPP), які ў 2017-2019 гг. займаўся вывучэннем агульных, а таксама розных умоў, каштоўнасцей і практыку музеяў у разнастайных і імкліва мяняючыхся грамадствах, распрацоўкай новага азначэння музея, адпавядаючага сённяшнім патрабаванням. Па выніках актыўнага абмеркавання і супастаўлення альтэрнатыўных варыянтаў азначэння тэрміна "музей" Выканаўчы камітэт ІКОМ ў ліпені 2019 г. прыняў яго новы варыянт, які быў вынесены на разгляд Генеральнай асамблеі ІКОМ у верасні 2019 г. У новай фармулёўцы музей – гэта "демакратызуючыя, інклюзіўныя і паліфанічныя прасторы, створаныя для крытычнага асэнсавання і абмеркавання

мінулага і будучага. Адказваючы на бягучыя канфлікты і выклікі часу, музеі захоўваюць для грамадства эталонныя артэфакты і прадметы мастацтва, аберагаюць і перадаюць наступным пакаленням гістарычную памяць і забяспечваюць роўныя правы і роўны доступ да культурнай спадчыны для ўсіх людзей. Музеі існуюць не дзеля прыбытку. Іх дзейнасць заснавана на прынцыпах партыцыпацыі і празрыстасці, і будуецца вакол актыўнага супрацоўніцтва з рознымі супольнасцямі. Працуючы ў імя чалавечай годнасці, сацыяльнай справядлівасці, глабальнага роўнасці і дабрабыту ў маштабах планеты, музеі акумулююць, захоўваюць, вывучаюць, інтэрпрэтуюць і экспануюць самыя розныя ўяўленні аб свеце" [7]. Такім чынам, у новай фармулёўцы падкрэсліваецца сацыяльная роля музея і неабходнасць яго ўзаемадзеяння з грамадствам. Зараз, каб лічыцца музеем, установа павінна не толькі захоўваць спадчыну, але і быці інклюзіўнай, працаваць з разнастайнымі суполкамі грамадства і думаць як пра мінулае, так і пра будучае.

Міжнародная практыка паказвае, што сучасныя музеі выконваюць важную місію – яны ствараюць культурна-адукацыйны асяродак, які з'яўляецца істотным стабілізуючым фактарам грамадства, выхоўваюць талерантнасць у адносінах паміж прадстаўнікамі розных культур. І многія беларускія музеі здольныя ўзяць на сябе большую сацыяльную адказнасць, што павінна быць замацавана ў нарматыўна-прававой базе. У артыкуле 159 Кодэкса аб культуры місія беларускіх музеяў па-ранейшаму звязана толькі з захаваннем і папулярызацыяй матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны, нацыянальных культурных традыцый.

Кодэксам вызначаны асноўныя крытэрыі класіфікацыі беларускіх музеяў. Па форме ўласнасці яны падзяляюцца на дзяржаўныя і прыватныя. Паказаны профільныя групы: гістарычны (агульнагістарычныя, ваенна-гістарычныя, археалагічныя, этнаграфічныя, гісторыі рэлігіі, гістарычныя манаграфічныя, сучаснай культуры, іншыя гістарычныя музеі); прыродазнаўчы (прыродазнаўчыя музеі шырокага профілю, геаграфічныя, біялагічныя, заалагічныя, батанічныя, геалагічныя, мінералагічныя, антрапалагічныя, іншыя прыродазнаўчыя музеі); мастацкі (выяўленчых мастацтваў, дэкаратыўнапрыкладнога мастацтва, народнага мастацтва, палацавага і паркавага мастацтва, мастацкія манаграфічныя, іншыя мастацкія музеі); літаратурны (музеі гісторыі літаратуры, гісторыі кнігі, літаратурныя манаграфічныя, іншыя літаратурныя музеі); комплексны (мемарыяльныя комплексы, гісторыка-мастацкія, краязнаўчыя музеі, музеі архітэктуры і этнаграфіі, гісторыка-культурныя запаведнікі, іншыя музеі) [3, арт. 161]. Метадычнымі і каардынацыйнымі цэнтрамі для дзяржаўных музеяў гістарычнага і прыродазнаўчага профіляў з'яўляюцца Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, для музеяў мастацтвазнаўчага профілю – Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, для музеяў літаратурнага профілю – Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, на абласным (мінскім гарадскім) узроўні – абласныя (мінскія гарадскія) дзяржаўныя музеі, на раённым (гарадскім) узроўні – раённыя і гарадскія дзяржаўныя музеі [3, арт. 165].

Артыкулам 166 Кодэкса аб культуры вызначаны асаблівасці прававога становішча і парадак дзейнасці музеяў-запаведнікаў і музеяў пад адкрытым небам. Да музеяў-запаведнікаў адносяцца музеі, якія размяшчаюцца ў комплексах і ансамблях нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, разам з тэрыторыяй, гістарычна і культурна звязанай з гэтымі нерухомымі матэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі. Да іх адносяцца Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж" , Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік", Гомельскі палацава-паркавы ансамбль, Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе". У музейны фонд музеяў пад адкрытым небам уключаны комплексы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, або калекцыі матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, іншыя рухомыя матэрыяльныя культурныя каштоўнасці, сістэматызаваныя і прадстаўленыя на тэрыторыі, якая гістарычна і культурна не звязана з імі [3, арт. 166]. Такое азначэнне тэрмінаў адпавядае музеязнаўчым навуковым падыходам. Сёння тэрмін "Музеі пад адкрытым небам" выкарыстоўваецца ў адносінах да музеяў, створаных на падставе

звезеных помнікаў, або змешанага тыпу. Музеі пад адкрытым небам, створаныя шляхам музеефікацыі архітэктурных ансамбляў, ландшафтаў, пасяленняў, як правіла, называюць музеямі-запаведнікамі [5].

Асноўныя аб’екты і экспазіцыі музеяў пад адкрытым небам размешчаны па-за памяшканнямі, на адкрытых тэрыторыях. У музейнай практыцы да іх адносяць музеі пасяленчага тыпу, у тым ліку і “скансены” (музейныя вёскі, асобныя дамы, археалагічныя помнікі пасяленчага тыпу, гістарычныя рэканструкцыі); музеі “функцыянальнага тыпу” (музеі асобных відаў дзейнасці, галін гаспадаркі, музеі тэхнікі, транспарту і інш.). Першым айчынным скансенам з’яўляецца Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і быту, які адносіцца да музеяў этнаграфічнага комплекснага профіля, дэманструе народную, традыцыйную культуру краіны ў адзінстве яе рэгіянальных і лакальных асаблівасцей. Музей быў адчынены для наведвальнікаў у 1976 годзе. А першы ў Беларусі археалагічнага музея пад адкрытым небам створаны ў 2019 г. у Нацыянальным парку "Белавежская пушча". Шэраг музеяў маюць асобныя экспазіцыі пад адкрытым небам, напрыклад, Музей чыгункі ў Баранавічах дэманструе чыгуначную тэхніку. Музеі пад адкрытым небам з’яўляюцца аб’ектамі павышанай зацікаўленнасці сучасных турыстаў і таму відавочна неабходнасць стварэння такіх музеяў у культурна-гістарычнай прасторы кожнага рэгіёна.

Асаблівасці прававога статусу музеяў пад адкрытым небам, музеяў-запаведнікаў заключаюцца таксама ў тым, што яны маюць пераважнае права на ажжыцяўленне культурнай і іншай дзейнасці на сваёй тэрыторыі, у тым ліку і экскурсійнае абслугоўванне; могуць ствараць навукова-метадычныя і іншыя саветы, мець уласную сімволіку; устанаўліваць спецыяльны рэжым захавання музейных прадметаў з улікам з улікам размяшчэння іх у нестабільных светлавых і тэмпературна-вільготнасных; дазваляецца выкарыстоўваць музейныя прадметы ў мэтах адраджэння, развіцця і папулярызацыі народных рамёстваў, традыцыйных тэхналагічных працэсаў гаспадарання, вытворчасці, прыгатавання асобных відаў прадуктаў харчавання нацыянальнай кухні; могуць ажыццяўляць дзейнасць па раслінаводству, жывёлагадоўлі, вытворчасці тавараў народнага спажывання, прыгатаванню прадуктаў харчавання з прымяненнем тэхналогій і прылад працы, якія выкарыстоўваліся ў пэўны гістарычны перыяд і рэалізоўвацца сваю прадукцыю ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства [3, арт. 166].

Згодна патрабаванням артакула 167 Кодэкса ў мэтах арганізацыі ўліку музеяў усіх формаў уласнасці, якія знаходзяцца і дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ствараецца рэестр музеяў, які ўяўляе сабой сукупнасць звестак аб музейных установах, іх філіялах, выставачных залах, культурных цэнтрах. Пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь устаноўлены формы вядзення рэестра музеяў [6]. Фарміруе і вядзе яго Нацыянальны гістарычны музей. Рэестр з'яўляецца адкрытым, доступ да яго дадзеных забяспечаны шляхам размяшчэння на афіцыйным сайце Міністэрства культуры. Напрыканцы 2019 г. рэестр уключае звесткі аб 153 дзяржаўных музеях сістэмы Міністэрства культуры і адным прыватным музеі. У тым ліку 10 музеяў рэспубліканскага падпарадкавання. Самую шматлікую групу складаюць музеі комплекснага профіля – 50%, гістарычныя і гісторыка-краязнаўчыя музеі - 37%, мастацкія – 8,4%, літаратурныя – 2,6%. Сетка дзяржаўных музеяў уключае 93 філіялы. Музеі, якія з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі, або юрыдычныя асобы, падраздзяленнем якіх з’яўляецца музей, у тэрмін не пазней за дзесяць каляндарных дзён з дня стварэння музея абавязаны прадстаўляць свае звесткі (найменне, профіль (профілі), месца знаходжання, рэжым работы музея, яго заснавальнік і іншае) ва ўпраўленні культуры аблвыканкамаў, якія не пазней за трыццаць каляндарных дзён з дня атрымання звестак аб музеі абавязаны разгледзець іх і накіраваць юрыдычнай асобе, упаўнаважанай Міністэрствам культуры, свае прапановы аб уключэнні музея ў рэестр музеяў [3, арт. 167]. На сённяшні дзень рэест не прадстаўляе поўны пералік беларускіх музеяў і музейных аб’яднанняў. Музеі Міністэрства культуры складаюць прыкладна дзясятую частку ўсёй музейнай сеткі краіны. Больш за 1600 музеяў адносяцца да іншых ведамстваў: Міністэрства

адукацыі, Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства унутраных спраў, Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь і інш. [4, с.381-382].

Кодэксам вызначаны статус і кампетэнцыі Рэспубліканскай Рады дырэктараў музеяў, Рэспубліканскі навукова-метадычны савет па пытаннях музейнай справы. Уключаны нормы, якія рэгулююць фондавую, экспазіцыйна-выставачную работу музея, правы і абавязкі наведвальнікаў музеяў.

Адным з ключавых момантаў уліку, упраўлення і кантролю за музейнымі калекцыямі з'яўляецца стварэнне і вядзенне прафесійнага каталога, які служыць надзейным сродкам па ахове музеяў, забяспечвае прафілактыку незаконнага звароту культурных каштоўнасцей. Ён таксама спрыяе належнаму кіраванню мабільнасцю фондаў. Гісторыя стварэння і вядзення Дзяржаўнага каталога асвятлялася аўтарам ў артыкуле, прысвечаным дзяржаўнай музейнай палітыцы [1, с. 73-74]. На сучасным этапе ў адпаведнасці з заканадаўствам цэнтралізаванаму ўліку падлягаюць асабліва каштоўныя музейныя прадметы, уключаныя у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь [3, арт. 177]. Рашэнне аб аднясенні музейных прадметаў да асабліва каштоўных прымаецца музеямі і ўзгадняецца з адпаведным экспертным саветам, які створаны пры Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Звесткі, якія змяшчаюцца ў Дзяржаўным каталогу Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца адкрытымі і размяшчаюцца на яго афіцыйным сайце.

Такім чынам, у Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры кадыфіцыраваны асноўныя нарматыўныя прававыя акты, рэгулюючыя музейную дзейнасць. Рэгламентаваны пытанні стварэння, рэарганізацыі і ліквідацыі музейных устаноў, вызначаны місія і статус музея, мэта і галоўныя накірункі дзейнасці, асноўныя паняцці, удакладняецца прававое становішча музеяў-запаведнікаў, музеяў пад адкрытым небам.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Бярэйшык, Л.У. Дзяржаўная музейная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь // Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст. : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 29-30 ліст. 2018 г. Мінск : БДУ, 2018. С. 72-76.
2. Документы ИКОМ. Устав Международного совета музеев (ИКОМ) // ICOM. Russia [Электронный ресурс]. 2017. URL: http://icom-russia.com/data/ustavnye-dokumenty/.
3. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, 20 ліпеня 2016 г. № 413-З // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. 2016, № 31. 2/2412.
4. Крывашэй, Д.А. Дзяржаўная культурная палітыка ў Беларусі (1991-2010 гг.). Мінск: Беларуская навука, 2014.
5. Музеи под открытым небом // Российская музейная энциклопедия [Электронный ресурс]. 2002. URL: http://www.museum.ru/rme/sci_openair.asp.
6. Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь 25 лістапада 2016 г. № 56 "Аб устанаўленні форм для вядзення рэестра музеяў" // Kodeks.by. [Электронны рэсурс]. 2016. URL: https://kodeksy-by.com/norm_akt/source.
7. Светлов, Б. Кодекс Беларуси о культуре содержит более 60 новаций // Belarus.by. Официальный сайт Республики Беларусь. [Электронный ресурс]. 2016. URL: http://www.belta.by/opinions/view/kodeks-belarusi-o-kulturesoderzhit-bolee-60-novatsij-4985/.
8. Museum Definition // ICOM [Электронный ресурс]. 2019. URL: https://icom.museum/en/activities/standards-guidelines/museum-definition/.


УДК 902/904+930

## СТАНОВЛЕНИЕ И РАЗВИТИЕ КАФЕДРЫ АРХЕОЛОГИИ И СПЕЦИАЛЬНЫХ ИСТОРИЧЕСКИХ ДИСЦИПЛИН НА ИСТОРИЧЕСКОМ ФАКУЛЬТЕТЕ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

**А.А. Егорейченко**

*Белорусский государственный университет,*
*пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь; yegor_alex@mail.ru*